Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: Вільня, Віленская вул., № 29

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес—25 к. За граніцу: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р. 3 мес.—1 р. Пер мена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі прысланыя у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго хто яе прысылае. Можна таксама падпісаць проэвішча разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад

Год IX. 27 Лютаго 1914 г. № 9

## Запахло порахам.

Газэты ізноў загаварылі аб вайне. Эўропа з году на год як волдаўбні чэкае вялікай, агульна-эўропэйскай вайны Палітыкі веруць, што гэткая вайна не мінуча і, дзеля гэтаго, каб утрымаць у Эўропе згоду, с кожным годам эўропэйскіе гасударствы павялічываюць свае военные сілы, затрачываючы мільёны мільёноў на утрыманьне войска, або, як іншые кажуць—аружнаго спакою.

На гэты раз першые паднялі гоман нямецкіе газэты. Немцы кажуць, што военная сіла Расеі с кожным годам узрастае і крэпне. Расея, кажуць яны, ужо здалела залечыць раны па Японскай вайне. Яна паставіла нормальна свае грашавые справы пры помачы Франціі і з грашамі вырабіла акуратны военны план на выпадак эўропэйскай вайны. І дзеля таго, што план вааружэньня мае закончыцца у 1914 гаду, то гэты няўпынны разрост сіл Расеі трэба папярэдзіць, пакуль ня позна Барон Гай у сваей прамове даводзіў перэд вэнгерскімі магнатамі, што Эўропа, а асабліва Аўстро Вэнгрыя і Нямеччына загрожэна не баспекай дужа блізкай вайны І вайна гэта будзе, казаў ён, на на жыцьцё і сьмерць.

З другога боку «Нов Время» такі не двузначна заклікае расейскае грамадзянства да вайны з Аўстрыю, за Галіччыну (Чырвоную Русь), старонку населенную украінскім народам Меншыков у „Н Вр.“ кажэ: «пара зразумець, што чырвона-рускае пытаньне, гэта не аўстрыйскае пытаньне. а пытаньне расейскае, бо для Аўстры Галічына—чужое дабро, хоць і даўно захопленае».

Гэткім парадкам выяўляецца мала памалу каму і нашто патрэбна вайна. Вайна у Расеі патрэбна для націоналістоў з мэтай абрусеньня украінцоў у Галічыне. І калі узяць пад увагу, што «Нов. Вр.» выражае думкі ня толькі націоналістоў. але і кіруючых кругоў. і калі звярнуць увагу на тое, што на украінцоў у Расеі усё узрастаюць рэпрэсіі, то можна думаць, што вядомые кругі планамерна такі вядуць работу над тым. каб дзеля націоналістычнай палітыкі уцягнуць Расею ізноў у кровапралітную вайну. Украінскае пытаньне цяпер асабліва коліць вочы розным націоналістам, а гэта таму, што украінцы у Аўстрыі могуць свабодна развіваць сваю національную культуру, а апошнімі часамі дабіліся ешчэ і украінскаго унівэрсытэту у Львові. Націоналісты баяцца, што унівэрсытэт украінскі будзе разсаднікам украінскай сьвядомасці у Расейскай Украіне, а нават іншые з іх думаюць, што уплыў яго датрэ аж да Беларусі. І вось „сфэры“ пастанавілі зрабіць украінскае пытаньне, пытаньнем міжнароднаго значэньня.

Военны агонь у Нямеччыне падтрымліваецца бадай што іншымі ўплывамі. Там знаходзяцца знаменітые Круппоўскіе фабрыкі аружжа і гэтые фабрыкі штогоду вытрачываюць вялікіе грошы на «военные» стацьці у газэтах. Як толькі газэты пачнуць крычаць аб небаспечнасці вайны і інш., на фабрыкі сыплюцца ад розных гасударствоў заказы на аружжэ ..

А за ўсю палітыку Круппоў, Гаёў і Меншыкавых у канцы канцоў павінны расплачывацца селянін і работнік. Яны са сваей працы павінны пакрыць тые мільёны мільёноў вытрачываных Эўропай на утрыманьне аружнай сілы і дацьатарваўшы ад работы у полі і каля варштату, насіцелёў аружжа.

**Лемеш.**

## Асцярога эмігрантам.

Даўным даўно разумные людзі казалі што з эміграцкай гарачкі, якая была агарнула наш край, нічога добраго ня выйдзе; тые ж самые людзі казалі, што нам трэба не у Амэрыку уцекаць са сваей старонкі на выслугі амэрыканскаму капіталу. а на мейсцы у сябе стварыць Амэрыку. Працай разумнай і трывалай вытвараць багацьце на мейсцы у сябе. то і карысць будзе з гэтаго, бо у сваім краю, у сваей хаці — свая воля і сіла“.

Выезд на чужыну выдумка неўдалая для працавітых людзей і на выездзе у Амэрыку мала хто с працавітых людзей разжыўся, апрача розных агентоў, каторые прадаючы людзей, як скаціну, на капіталістычную бойню нішто сабе маюцца, але яны выпхнуўшы тысячы народу у Амэрыку усё-ж такі самі не паехалі туды, а асталіся у нашым краю.

Гандаль людзьмі, як відаць рэч карысная, бо у апошніе гады у нашым краю, і скрозь на пагранічы, намножылося бяз ліку кантор перэпраўляючых людзей у Амэрыку, тысячы агентоў загоншчыкоў жывуць сабе сыта з гэтаго промыслу. Гэтак справа стаіць у нас, на мейсцы, ды іначэй там, куды адурэные агентамі людзі пайшлі шукаць золата і шчасьця.

Як вядома Поўночная Амэрыка перэжывае цяпер востры прамысловы крызыс Тавару на фабрыках болей чым пакупцоў на яго і фабрыкі закрываюцца і выкідаюць сотні тысячы работнікоў на гарадзкіе вуліцы, на галодную сьмерць. Гэтак сама крызыс і ў жалезнадарожных кампаніях. Жалезнадарожные кампаніі прыцягнулі вялікіе капіталы на будоўлю чугунак у надзеі, што пустые землі заселюцца эмігрантамі і чугункі будуць даваць вялікі даход Тым часам знайшлося дужа мала ахвотнікоў гнаіць сваімі касьцямі амэрыканскіе пустыні і ў рэзультаці аказалося, што дарог болей, чым ездакоў і заместа даходу у будучыне на затрачэные капіталы, капіталістам астаецца адно безканечна доўгіе гады даплачываць мільёны на утрыманьне дарог. Гэтак прыпынілося будаваньне дарог і ізноў паляцелі тысячы тысяч людзей з мейсц с правам памерці галоднай смерцыю на кіпучых жыцьцём вуліцах амэрыканскіх гарадоў.

А тым часам распушчэные ад розных кантор загоншчыкі агенты заганяюць народ у Амэрыку і людзі едуць. роючы у думках надзею знайсці за морэм шчасьце Тым часам выкінутые на амэрыканскі берэг эмігранты сустрэчаюцца вока ў вока з голадам, холадам і без рабоціцай.

Якое цяпер палажэньне эмігрантоў у Амэрыцы, тых што даўно туды паехалі відаць хоць-бы с таго, што у Чыкаго налічаюць больш 300,000 безработных; з гэтаго ліку больш 100,000 без страхі над галавой і якога небудзь прыпынку А работы у горадзе усё меншае і меншае: фабрыкі закрываюцца

У Ню Ерку безработных ешчэ болей як у Чыкаго.

У Філадэльфіі—80 тысяч

У Бостоне, Пітсбургу, Балціморы—сотні тысяч.

Работнікі з Расеі ахвотна ідуць на работу за адны харчы ды не бяруць ..

Тысячы работнікоў хочуць вярнуцца назад ды німа грошы!

А народу усё прыбывае: праз кожные дзесяць дзён з Лібавы атходзяць караблі нагружэные людзьмі, каторых нагаварылі агенты. Параходные Таварыствы добра зарабляюць, добра зарабляюць і агенты.

А што будзе з эмігрантамі аб гэта ні параходзтвы ні агенты не бядуюць іх дзела узяць грошы за „пляц карту“ адлічыць у свой кішэнь працэнты і выкінуць груз на Амэрыканскім берэгу.

**В Л.**

## Па сваім шляху!

Адзін з найцэннейшых скарбоў які паасобны народ можэ унясці у агульна людзкую скарбніцу, гэта ёсць яго літэратура.

Літэратура адбівае у сабе душу народу; яго «трывожные думы», яго „чулые і хвалюючые пачуцьця“, яго зразуменьне „душу радуючай красы“.

І мы беларусы унясьлі ужо нашу цэннасць у агульна людзкую скарбніцу і мы ужо не бязплоднае дрэва каторае павінно быць высечэно і спалено: мы ужо далі плады.

Максім Богдановіч у „Колядцай Пісанцы 1913 г.“ пісаў, што нам беларусам цяпер ужо ня трэба канечна шукаць дум і пачуваньнёў у чужынцоў, а што нават і чужынцы са старымі і багатымі літэратурамі, могуць чагось і у нас пашукаць „бо іншы раз таго, што маем мы не знойдзецца і у іх“.

І гэта сказана саўсім справядліва: у апошніе годы нашы пісьменьнікі унясьлі не мала цэннаго у беларускую літэратуру, але усё ж такі пакуль што наша літэратара не мае ўсесьветнаго значэньня.

Хоць і зьяўляюцца час ад часу перэклады беларускіх літэратурных твороў на расейскую, украінскую, чэскую, нямецкую і інш. мовы, але перэкладаюць нашы творы дагэтуль не таму, што шукаюць у іх разгадак „на трывожачые душу пытаньня“, а толькі дзеля таго, што у гэтых творах адбіваецца наша національная душа і яе асобны характар, каторы цікавы чужынцам сваей арыгінальнасьцю.

Гэтаго мала.

Мы павінны даць сьвету болей! На нашых «навінах» павінна быць багатая урода мы павінны знайсці у сябе і даць свету новые думы, сказаць новае слова.

А калі мы скажэм новае слова, калі мы тым, што па горах ходзюць і не бачуць сонца, пакажэм яго, тады мы раз на заўсёды заваюем права называцца культурным народам, тады на край сьвету пралунае слава беларускаго імені і да нас прыйдуць людзі шукаць новых пуцяводных зор, новых праўд.

Ніхай хто небудзь з нашых пісьменнікоў напішэ хоць адну рэч каторая бы паказывала новые дарогі чэлавечэству і ня будзе на сьвеці знаючаго літэры народу, каторы-бы пасьля гэтаго, хто і што такое беларускі народ ня ведаў.

Усе агранічэньня беларускай мовы, усякіе самненьня што да права яе на развіцьцё і жыцьцё, як трэскі пад напорам вады разляцеліся б

Адзін геніяльны твор напісаны па беларуску можэ даць славу і пашану нашаму народу!

І мы павінны кіравацца да гэтаго Во гэты доўг мы маем перэд сваім народам, каторы павінны сплаціць.

Чытаючы і перачытываючы беларускую літэратуру знаходзім у ей многа цэннаго: і хвалюючые думы, і дэлікатные ды чулые перэжываньня і цікавые літэратурные формы, але не знаходзім шуканьня новых праўд, новых дарог.

Есць хворые, калекіе тыпы, адживаючые і аджыўшые, але німа тыпу чэлавека будучыны.

Праўда, што у гэтым многа вінават ўплыў вялікіх суседзкіх літэратур, як расейскай так і польскай, с каторых вытхло вялікае, здаровае, уступаючы мейсцо хвораму і калекаму.

Наша літэратура дагэтуль прэдстаўлне у міньятюры, свойскай масці адбіцце ідэолёгіі гэтых вялікіх літэратур і гэта брыдкі яе грэх.

Мы павінны аткінуць благі ўплыў бульварнай і нэўрастэнічнай суседзкай літэратуры.

Мы. народ малады і здаровы, павінны тварыць сваю асобную, дужую маладой сілай літэратуру будучыны

Нашы пісьменнікі павінны выраблдць талент свой не на дэкадэншчыне, а на ўсесьветнай клясычнай літэратуры; павінны ня толькі раскрываць раны свайго грамадзянства і паказываць яго калецтвы, але і шукаць чэлавека будучыны, чэлавека сільнаго, здароваго; чэлавека цара прыроды.

Мы павіны шукаць і знайсці новы шлях і паказаць яго тым, што дагэтуль па горах ходзючы не бачуць сонца..

**Юры Верэшчака.**

барані Боже, і з нашым дзяком. Ну бывай, кум, здароў, а мне. трэба схадзіць аж у Вуклю, сказаць дзяку, што заўтра будзе абедня па першай маей жонцы. Пакуль туды, ды назад, так і дзень пройдзіць». — «Толькі ты як будзеш з ім гаварыць, то гавары па рускy, бо ён нашай мовы беларускай дужа ня любіць. Фэлька казаў папаў ад яго: — «што ты›,— кажэ, —„у Расеі жывеш, а па расейску гаварыць ня ўмееш. Ведай што ад гэтай мовы цяпер трэба адвыкаць. Гэткай мовай толькі мужыкі гукаюць!›—«Ніхай ён і адвыкае; а я як умею, так і гукаю. Ну, бывай здароў! А можа заўтра на абедню прыйдзеш кум?» — «Ня ведаю... ведаеш, кумок, дужа некалі: дроў німа ні палена, трэба як колечы старацца... а штож, я... знаў нябошчыцу — добрая была кабета.. дай Божэ ей неба! А мая Гануля то і вось як часта успамінаець. Дзякуй, кумок, за прозебу, алі ня буду.»—«Вот ешчэ бяда», — кажэ астанавіўшыся Янук Базылю: «хадзіў у казёнку, хацеў ўзяць крыху на памінкі- а манапольшчык адказаў, што німа сівухі. Казаў, як стаў таргаваць, то ніколі небыло такога вялікага торгу: за гэты месяц прадаў на дзьве тысячы рублёў, а прывязьці ня можна, бо кепская дарога і сядзіць ў пустой казёнцы.»—«Па гэтым, кумок, ні бядуй! Вун каля цэрквы жыд Габа «растаптаны» цэлы воз прыцягнуў з мястэчка Барсолі; ды і ў піўных яна пастаянна бываець: усе піўнікі кажуць, што без яе і на піва німа ходу. Хоць і даражэй заплаціш, алі па жыдох можна на патрэбу найці колькі трэба. А рана заўтра будзіць абедня?› Казаў бацюшка, што ў восьмай гадзіне.›—«Ну то і я з Гануляй прыйду. Усёж за душу кумы трэба пацеры змовіць».—«Прыйдзі. А я пабягу шукаць дзяка.»

Чуў гэта *Сын Алюсі.*

## З Міншчыны.

### Ешчэ аб лясным голадзе.

(*З Барысоушчыны.*)

У № 50 „Н. Н.“ за леташні год у корэспандэнціі з Ігуменскаго пав. ішла гаворка аб аднэй з сучасных «бытавых» з'яў, вырубцы ласоў за каторай у недалёкай будучыне пэўне прыдзе лясны голад. Гэта з'ява дужа характэрна ня толькі для Ігуменшчыны але і для нашаго павету (Барысоўскаго) ды і агулам для ўсей Беларусі. Цяпер у нас усе, як малые панкі так і магнаты займаючые абшары у тысячы і дзесяткі тысячоў дзесяцін без упынку сякуць лясы, прадаюць іх і сплаўляюць заграніцу, ды наробюць праз гэта такой бяды, што скора прыдзецца хоць зубы на паліцу класьці. Ужо шмат паменшала лясоў а ніхай пройдзе ешчэ гадоў 20 — 30 і ніякіх перамен ня будзе г. зн. калі ня будзе забаронена паном руйнаваць лясное багацьце нашаго краю — дык бадай што і веніка ня будзе с чаго звязаць.

Бяз лесу у нашых варунках абыйсціся німа як. Спаліваць у печы гной, як гэта робіцца цяпер у некаторых бязлесных губэрнях у нас ня можна, бо на нашай зямлі калі не даць гною нічога ня вырасьце.

Каменнае вугальле, торф...

«Але для гэтаго трэба былоб нанова перэрабляць печы—дастаўка гэтаго па нашых благіх дарогах шмат будзе каштаваць».

Нашые селяне гэткіе бедные што і цяпер ніяк з грашмі вывярнуцца ня могуць, калі-ж апал будзе шмат даражэй каштаваць яго ня можна будзе дакупіцца і прыдзецца мерзнуць ешчэ болей як цяпер.

Будавацца так сама шмат цяжэй будзе як ня хопіць лесу, бо ўсе іншые матэрьялы даражэй каштуюць. Клімат краю—псуецца ад таго калі мала лясоў; ужо і цяпер болей благіх гадоў як даўней — у летку усё сьпякота, або дажджы, зімы бязсьнежные.

Адным словам сумная будучына нас чэкае. Не праўду толькі кажэ аўтор карэспандэнціі у № 50 «Н. Н.» што мы яе самі робім. Не, не самі, бо не да нас належуць лясы, ня мы беларусы, адвечные жыхары гэтаго краю,—гаспадары над імі.

Нішчуць багацьце Беларусі — памешчыкі. людзі з нашым народам і яго патрэбамі не звязаные. гаворучые чужой мовай, людзі найболей не пачуваючые ніякіх грамадзянскіх абавязкоў да тэй старонкі якая іх корміць.

Вось ня мы самі—не працуючы беларускі народ гатуе сумную будучыну сваей старонцы—гатуюць яе людзі чужые .. На іх і нарэкаць трэба.

Ды што ужо аб будучыне казаць калі і цяпер гэткая лесная гаспадарка ужо косьцьцю у горлі нам становіцца.

Паны прадаючы дзесяткі і сотні тысяч пнёў купцам сплаўляючым дрэва заграніцу — селяніну калі трэба дрэва на новую будыніну, ці які сажэнь дроў у печ — прадаюць надта неахвотна, бо як кажуць з гэткай прадажай болей клопату. Здаровае дрэва расце толькі для заграніцы. селяніну калі німа сухастоін, ці буралому часта ня можна за гатовые грошы—нідзе у усей аколіцы—дрэва дакупіцца *Лявон Гмырак.*

### С Палесься.

Недахват корму Гаспадары бядуюць. Скаціна саўсім змарнела, чуць ногі валочыць Лета было даждлівае і ніхто не загатаваў сена каб пракарміць жывёлу, а да травы ешчэ далёка. Скаціна корміцца аднэю саломаю. Выпісываюць сена вагонамі, але яно дарага абходзіцца: 50—60 кап. с даставкаю пуд, отрубы 70—75 кап. Хлеб і бульба урадзіліся блага. Зарабаткоў німа. Дарагавізна страшэнная, а тут ешчэ як на пакусу усюды манаполька, буфэты, каторые цягнуць с кішэні апошніе асьмакі. Ведама, наш просты чэлавек німае ніякай разумнай забавы, якая бывае па гародох для паноў. Яму на забаву аткрылі казённые «бухфеты», куды ён і нясе свае грошыкі, зароб леные мазалістымі рукамі. Пьюць ўсе страшэнна: мужчыны, бабы, дзеці. Калі не закрыюць «бухветоў›, то ўсе селяне зробяцца горкімі пьяніцамі і пойдуць па сьвету старцамі.

*Д. М.*

## З Вітэбшчыны.

### Беларуская вечарынка.

9 лютаго гэт. году у залі Гражданскаго Клуба была устроена дабрачынная (благатварыцельная) вечарынка у карысць не багатых слухачоў вучыцельскаго інстытуту. Глаўны цэль гэтай вечарынкі быў той, каб азнаёміць вітэбскую „інтэлігенцію“ з жыцьцём і пачуваньнямі нашаго селяніна. Дагэтуль з іх ніхто ня ведаў праўдзіваго селяніна Наш селянін для мейсцовых інтэлігентоў гэта дзікун, каторы усё сваё жыцьцё пьянствуе, лаецца брыдка, бьецца кольлямі, ды нажамі.

Якжэ былі здзіўлены нашы «паны» калі ўбачылі і пачулі са сцэны, што беларускіе песьні нічым ня горэй ад маларускіх (украінскіх) і вялікарускіх. Хор слухачоў Вітэбск. Учыць. Інстытута згодна, голасна і дужа хараша сьпеяў „Чэлавек жонку б'ець...“ і многа другіх народных песень. Горкая доля замужнай беларускі, як жывая, устала перэд вачамі кожнаго чэлавека. Посьле выйшоў вядомы у Вітэбшчыне пісьменьнік А. Р. Пшчолко і расказаў перад публікай многа сваіх расказоў з беларускаго народнаго жыцьця. Першы раз у Вітэбску наш селянін беларус загаварыў са сцэны аб сваім горкім жыцьці і думках. А. Р. Пшчолко дужа жыва расказываў.

Народу набралося поўна зала. Было дужа вясёла Збор быў поўны. Многа якіе інтэлігенты гаварылі ідучы дамоў: „Які жэ хітры і разумны наш селянін! І што-б было, каб да яго розуму дадаць гэтулькі багацтва і навукі?“ Во што згадаў публіцы інстытуцкі вечэр. *Д. Васілеускі.*

### Пажар.

У мястэчку Чашніках Лепэльскаго павету быў пажар у ноч 19 лютаго а 8 гадзіне, згарэла у пачтальёна, Янкі Максімава Вішнеўскаго, хата, пуня с сенам і хлевам, — у хлеві згарэла карова. Сам Янка ня быў дома затое што ён паехаў с почтай у мястэчка Чарэю Могілёўскай губ.,

---

пацеры. Конь аставаўся канём. Аўдакім ўрэшці адважыўся узяцца за повад і папрaвіў зьехаўшый каню пад бруха армяк. Як толькі Аўдакім стаў падводзіць пад вёску, конь пачуўшы сваю хату, стаў цягнуць повад і моцна іржаць. На гэтае іржаньне адазваліся у сяле сабакі: адны сярдзіта забрэхалі, а іншые і завылі. Аўдакіму стало жутка. Ен аглянуўся на каня і яму здалося, што конь мае саўсім іншы склад. Калі конь падыйшоў да Аўдакіма і, гуляючы, ухапіў зубамі за плячо кашулі, Аўдакім дзіка крыкнуў, выпусьціў з рукі повад і пабег ад каня, што было сілы. Конь ня хочучы астацца пабег у сьлед за гаспадаром.

— Ратуйця мяне, ратуйця мяне!--крычэў Аўдакім са страху, але конь гнаўся за ім у след да самай хаты. Убегшы на падворак, конь спакойна пайшоў на сваё мейсцо у хлеў.

Толькі акрапіўшы каня сьвянчонай вадой, супакоіўся напужаны Аўдакім.

**Язэп Шпэт.**

# Цікавы суд!

### (Хутары скацінку звялі).

Расказ Зрэбнаго аб выхадзе на хутары (№ 5 „Н.Н.“) напомніў мне вось якую фацэцю! У Ковенскай губ., асабліва ў Новоалександроўскім пав. селяне хутка пашлі на хутары. Разышлася і тая вёска, дзе жылі два браты, пра каторых я хачу расказаць. Старшаго празывалі Ерам, а меншаго проста—Сцепанам. Гаспадарка у іх была не вялікая: 5 дзес. зямлі, дзьве свіньні, кароўка і кабылка. Пакуль што, яны жылі разам, а як вышлі на хутар, дык і падзяліліся. Хутар ім папаўся пры сялібі. З гэтае прычыны ім не далі 5 дзес., а толькі 3, але колькі ня ёсць, а трэба раз дзяліць. Раздзялілі браты зямельку, падзялілі і скацінку: Сцепан ўзяў кароўку, а Ъ (ёр) кабылку. Раз прывёў Ъ сваю кабылку к Сцепанаваму вішніку і прыпяў па сваём хутары, але як прыпяў? «Што ні край, то і звычай». У нас прыпінаюць коні за шыю, у літоўцоў на аднэй вяроўцы прыпінаюць двое коні: путаюць пярэднюю правую нагу аднаго каня с пярэдняю леваю нагою другога. потым за пута прывязваюць вяроўкаю. Ъ прыпяў сваю кабылку ёшчэ мудрэй: за заднюю нагу!

У вішняку хадзіла Сцепанова карова. Каля поўдня на яе напалі мухі, авадні і сьлепаўні. Яна цярну лася аб вішні, задрала хвост, выскачыла раптам з вішніку і пабегла ў поле, як шалёная! Ъва кабыла, здэцца і не цікавая была, а спужалася. Забылася яна мусіць, што прывязана за заднюю нагу; забылася яна і тое, што паднявольнаму ніколі ня трэба раўнавацца с свабодным. На ўсім бягу (бегла яна з усяе сілы) як рванула яе вяроўка, дык нагу і выкруціла. Кабыла заваліласся. Прышоў Ъ паглядзеў на кабылу і хоць бы што! Хоць-бы вяроўку развязаў—дык не! Пашоў пазваў старасту і ешчэ колькі сяброў сваіх і апаняваў кабылу на 35 рублёў. Потым папоў ён у воласць і запісаў жалабу. але не на карову, ды на Сцепана. Сцепан ніколі ешчэ не судзіўся, дык затое і ня ведаў як што трэба рабіць. Ъ быў старэйшы, — а ужо-ж ведама што хто старэйшы, той і разумнейшы. Колькі разоў гаварыў Ъ з судзьямі як трэба, разоў два ці можэ і больш зайшоў з імі да Моўшы дык яны і ласкавейшые парабіліся. Скора братоў у суд пазвалі, а ешчэ скарэй дзела разабралі. Ці доўга-ж трэба умеючы? Разабралі яны яго гэтак скора, што Сцепан навіт добра ня мог і уцяміць с каго прысудзілі 35 руб. с каровы ці з яго. Па Сцепанаваму розуму дык тут ніхто невінават: ён не вінават, бо не казаў карові пужаць чужую кабылу, карова не вінавата дзеля таго, што ня ведала, што каля саду была прыпята кабыла і што яна выверне нагу. Каб гэта яна ведала, то можэ ў другі бок пабеглаб· Што яна ўздрочылася узноў такі не вінавата, бо хто не ўздрочыцца, як нападуць авадні ды слепаўні?! Як думаў Сцепан так і атказаў ў судзе. Пачуўшы гэта, судзьі ня ведалі, што і атказаць Сцепану, ажно замаўчалі усе. Але усякі ведае, што німа рахунку апраўдываць карову, бо скаціне хоць і якое дабро зрабі, а яна усё астанецца скацінаю Дык вось адзін судзьдзя зразумеў, што сказаць: „Карова зрабіла шкоду, ніхай яна і атвечае“ сказаў Іван (гэтак звалі судзьдзю). Ужо даўно гаварылі людзі, што Іван разумны чэлавек, а цяпер то усё аж не надзівіліся з гэтаго розуму. Праз 5 тыднеў прыехаў старшына з людзьмі прадаваць Сцепанаву карову (ён грошы не атдаваў Ъ-у). Скора прадалі яе Ъ-му сябру за 23 рублі і грошы атдалі Ъ. Ігнат вядзе карову, а Язэп памаленьку лізгае яе дубчыкам і кажэ: „Вот табе, пярэсценькая, ня здрочся другі раз, а то і таней прадамо!“ Пасьля гэтаго сабраліся людзі каля старшынавае каламажкі, ды рахуюцца, аткуль ешчэ узяць 12 рублёў. Але як тут прыдумаць, калі у Сцепана больш нічога німа? Ды ізноў такі — на дварэ неяк думкі у голаву не лезуць; сонцэ пячэ, пыл ў рот лезе... Старшына сеў ў каламажку, ды кажэ Ъ адезджаючы: „Пагаворым другі раз“. Разоў некалькі гаварыў Ъ пра гэта дзела с старшыною, сустрэціўшы яго ці у Моўшы ці іншдзе. Ці сыскаў Ъ з брата 12 рублёў ці не, добра няведаю, а што тые 23 рублі у Ъ разышліся ат частае гаворкі с старшыною і суседьдзямі, гэта добра ведаю, бо у паследнюю гутарку с судзьдзямі Ъ прасіў у Моўшыхі паўкварты на доўг.

Дык вот цяпер і німа жывёлы ні у Ъ ра ні у Сцепана. Ъ казаў, што гэта хутары вінаваты ў гэтым. Ня ведаю ці гэта праўда ці не, але Ъ гэтак казаў.

**Д. Д—ч.**

а жонка яго была у час пажару у свайго бацькі. *Янка с Чашнік.*

# З усіх старон.

**Нязгода паміж міністрамі.**

Пецярбурскіе газэты пішуць што ў новым саставе міністраў ня ўсё у парадку: — не ладзюць па між сабою новы прэдседацель міністроў Горэмыкін з міністрамі Шчэгловітовым і Маклаковым

**Проці асьветы.**

Міністр Кассо выдаў цыркуляр, каб пазваленьня на нядзельные школы выдаваліся з вялікай ась цярогай Гэта значэ, каб саўсім не выдаваліся.

**Проці хаўрусоў.**

У Вольску, Саратоўск губ., па загаду губэрнатара закрыты балакоўскі хаўрус прыказчыкоў, каторы быў аткрыты у 1906 гаду.

**Свабода слова і друку.**

= Пецярбурскі Градачальнік не пазволіў Таварыству Народн. Унівэрсытэтоў прачытаць лекціі аб скасаваньні паншчыны.

= Кацерынаслаўская адміністрація забараніла лекціі: Чулкову — «О іскуствѣ» (штукарстве) і Яблоновскаму „О ненарожденных“.

= У Пецербурзе 22 лютаго у ночы адбыліся обыскі у рэдакціях рабочых газэт: «Путь Правды», «Вѣрная Мысль» і «Рабочая Газета».

= Члена Г. Думы Бадаева цягнуць пад суд за супрацоўніцтво у газэці (ужо закрытай) «Правда Труда».

= У Пецярбурзе арыштавалі усю рэдакцію жаночай штотыднёвай часопісі „Женскій Журнал“. Арэштованые—адны кабеты.

= Зроблена обыск у рэдакціі газэты „Путь Правды“, прычом перэтраслі друкарню, а у памешчэньні рэдакціі паліція паразбівала замкі.

= Па загаду Херсонскаго губэрнатара арэштавалі на паўтара месяца, без замены штрафам, рэдактара газэты «Югъ».

= Прыастаноўлена да разбору дзела рабочая часопісь „Сѣверная Мысль“.

= Аштрафованы газэты: на 400 руб. «Биржевыя Вѣдомости», на 350 р. „Ільʼ“, на 250 р «Путь Правды“ і на 250 „День“.

= Сканфіскавалі бадай ці ня першы раз у жыцьцю нумэр чэрнасоценнай газэты „Новае Время“. Рэдактара М. Суворына цягнуць пад суд па стацьці за абразу войска.

**Обыскі і арэшты**

= У кватэры члена Г Думы Р В. Маліноўскаго калі яго самога і яго сэкрэтара не было дома паліція зрабіла обыск. У тую-ж ноч сэкрэтара арэштавалі.

= Пецярбурская ахрана“ у ночы ва ўсіх часцях гораду зрабіла шмат обыскаў, найболей у кабетработніц. Посьле некаторых обыскоў работніц арэштовывалі. Ужо арэштовано болей як 20 кабет.

= У Кіеві у ночы 20 і 21 студня арэштавывалі студэнтоў. Арэшты ставюць у звязку з юбілеем Шэвчэнкі.

= У Пецярбурзе 20 студня у звязку з убіўствам на трубочным заводзі зрабілі шмат обыскаў і арэштаў у работніцкіх кварталах. На шмат якіх заводах і фабрыках неспакойна.

= У Харкове у звязку з забастоўкаю у унівэрсытэце, жаночым мэдычным інстытуце. тэхнологічным і вэтэрынарным інстытутах зрабіла паліція массу обыскоў і арэштоў. Арэштавалі ужо 30 студэнтоў.

= На хутары Ларга (бэсарабшчына) сабраліся с пяці суседніх хутароў селяне, каб улажыць прашэньне да губэрнатара аб паменшэньню падаткоў на зямлю. У гэтым часе явілася паліція і шэсць „бунтаўшчыкоў“ арэштавала.

**Забастоўкі**

= У Пецярбурзе у звязку са скасаваньнем святкаваньня 19 лютаго адбыліся забастоўкі Баставало болей 20,000 (20 тысяч) работнікаў; на Пуцілоўскім заводзе — 15,000, побач з забастоўкамі былі обыскі і арэшты.

= У Тульскай казённай фабрыцы аружжа забаставало 900 работнікоў, за тое, што адміністрація фабрыкі выгнала аднаго рабочаго, каторы спазніўся толькі на паўгадзіну стаць на работу.

= За студзень (январ) адбылося 90 забастовак Баставало каля 30,000 работнікоў; у гэты лік ня ўходзіць 17 забаставак, у каторых не падлічэно чысло баставаўшых.

= У харкоўскім унівэрсытэці у звязку з неправільнымі паступкамі прафэсара Кіселёва былі безпарадкі. П афэсара гэтаго гналі студэнты вон за тое, што ён пры разборы дзела аднаго студэнта дапусціў у унівэрсытэт паліцію. Цяпер усе студэнты бастуюць. Ідзе забастоўка так сама у жаночым інстытуце мэдычным, тэхнолёгічным і вэтэрынарным інстытутах.

**„Жаночая сьвята“.**

23 Лютаго па ўсей Расеі меўся адбыцца так званы дзень „Жаночаго сьвята“, але дзякуючы шчырым старанням паліціі нігдзе гэта свята не ўдалося Заграніцай дзень «Жаночаго свята» адбываецца усюцы свабодна.

**Посны папечыцель.**

Папечыцель пецярбурскаго школьнаго округа загадаў дырэктарам гімназій пільнаваць, каб вучні пасьцілі

**Проці Шэвчэнкоўскай гадоўшчыны.**

У Пецярбурзі у псыхо нэўролёгічным інстытуці прафэсар Жаков дазволіў студэнтам зрабіць «Шэвчэнскоўскую раніцу». Калі студэнты прыйшлі то пабачылі, што дзьверы адведзенай ім залі зачынены. Тады каля 200 студэнтоў выдушылі шкло у дзверах і ўлезлі у залю. Там яны прапеялі «Заповіт» і др. украінскіе песьні. Канечна, явілася паліція і дружных украінцоў разагнала.

**«Істінно-русская» карьера.**

Рэдактар чэрнасоценнай газэты «Земшчына», п. Глінка спраўляў свой чорнасоценны нейкі юбілей. З гэтай прычыны пішуць другіе газэты, як п. Глінка дайшоў да рэдактарства, а вось як: с перша быў засуджэны на 6 год у катаргу за польскае паўстанне, пасьля упраўляў гарэлачным заводам, а пасьля меў у Ташкенці банкірскую кантору.

**Стэссэль.**

Ген. Стэссэля, што бараніў калісь ад Японцаў Порт-Артур, спаралiжавало.

**Свой на свайго.**

У Пецярбурзі акалодочны Іванов за несправядлівые вымаганьня па службе забіў прыстава Шэбаева. Посьле арэшту Іванов атруціўся.

Рэдактар-вадавец
А. Уласоў.

ЛЕПШЫ СЯБР ЖЫВАТА
ВІНО „СЭН-РАФАЭЛЬ“

На бандэролі кожнай бутелькі ёсць гэта подпісь

У маёнтку Вялікіе Граничы
Вілейскаго пав. Віленскай губ.
Дзедзіча Свіды, прадаюцца 400 дзесяцін зямлі, парэзаные на хутарскіе вучасткі рознай меры, у кожным ёсць сенажаць і лясочэк. 7 вёрст ад ст Уша Л. Р. ж. д. Аб варунках можна даведацца па адрэсу: *Горад Радашковічы, Віленскай губ., м. Вялікіе Граничы, Стэфану Свіда.*

ДАПУСКАЕЦЦА РАЗСРОЧКА
НАЙЛЕПШЫЕ У СЬВЕЦІ
ШЫНЫ СЛОН | ЮБІЛЕЙНЫЕ ЯСТРЭБ
Усіх размероў
БАНДАЖЫ
Накідкі для звозчыкоў
Т-во „ПРАВАДНІК“
Валікая вуліца д. № 96, Гр. Тышкевіча. Тэл. № 10—13.
ДАПУСКАЕЦЦА РАЗСРОЧКА

Будую усякіе
Незгараючые будоулі
Адрэс: Беларуская кнігарня для А С.
Завальная № 7, Вільня.

Толькі БЕЛАРУСАМ селянам
прадаюцца вучасткі зямлі у імень н Гай, каля самаго гораду Пінска Задатак па 20 руб. ад дзесяціны разсрочка платы на колькі гадоў па 6°/₀. Асабл ва важна для агароднікоў, рэмесьнікоў, фабрычных работнікоў і скатаводоў.
Э. Зуленіль, ім. Гай, каля гор. Пінска Мінск. губ.).

Вышлі з друку
№ 2 „Лучынка“
і № 20 „Саха“
адрэс:
Мінск, Александроуская, 25.

Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.